Председатель Совета по истечении срока своих полномочий в течение одного месяца может вернуться на свое прежнее место работы, его трудоустройство осуществляет соответствующий местный исполнительный и распорядительный орган.

Время работы председателя Совета на данной должности засчитывается в общий стаж работы, стаж работы по специальности, а также в стаж государственной службы.

Таким образом, статус главы местного самоуправления определен законодательством Республики Беларусь. Он компетентен решать вопросы местного значения, обладает обширными полномочиями по сравнению с иными должностными лицами местного самоуправления. Председатель местного Совета депутатов — это, прежде всего, представитель интересов населения в отношении с органами государственной власти, лицо, содействующее развитию региональных и международных связей территориальной единицы.

*А.У. Астапчук*
*БДУ (Мінск)*

## ЗЕМСКІЯ ОРГАНЫ САМАКІРАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

У пачатку XX ст. сацыяльна-эканамічныя, палітычныя и сацыяльныя абставіны, якія склаліся на тэрыторыі Беларусі, зрабілі магчымыя ўмовы для правядзення земскай рэформы.

Земскае кіраванне на тэрыторыі нашай дзяржавы ўзнікла пазней, чым у Расіі. Справа ў тым, што ў земскіх установах асноўнай кіруючай фігурай павінны былі стаць мясцовыя памешчыкі. Аднак пасля паўстання 1863—1864 гг. царскі ўрад палітычна не давяраў мясцовым памешчыкам «польскага паходжання» (напрыклад, у Мінскай губерніі іх было 94 %). Вядома, што для царызму выглядала непрыдатным аддаць земскую уладу у рукі «неблагонадзейных» асобаў. Але і на пашырэнне правоў мясцовага сялянства ўлады не пайшлі таксама, бо гэта разам з абмежаваннем правоў мясцовых памешчыкаў падрывала асновы дваранскай Расійскай імперыі.

Трэба адзначыць, што рашэнне царскіх улад пакінуць Беларусь па-за сферай дзейнасці земстваў, не выклікала колькі-небудзь прыкметнай барацьбы за земствы на месцах. Радыкальныя элементы сярод беларускага дваранства былі абяссілены паражэннем паўстання 1863 г., а беларускіх сялян пытанні новых зямельных

і маёмасных адносін цікавілі больш, чым пытанні мясцовага самакіравання і лад грамадскага жыцця. Тым не менш Палажэннем ад 2 красавіка 1903 г., у адпаведнасці з якім у шасці заходніх губернях (Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай) былі заснаваны губернскія павятовыя камітэты і ўправы па справах земскай гаспадаркі, быў пакладзены пачатак земскай рэформы. У адрозненні ад Расіі губернскія і павятовыя камітэты у Беларусі не выбіраліся, а прызначаліся міністрам унутраных спраў і губернатарамі. Характар створаных устаноў не дазволіў ім сур'ёзна палепшыць мясцовую гаспадарку і культуру.

Толькі ў 1911 г. быў выдадзены царскі ўказ аб увядзенні ў дзеянне ў беларускіх губернях Палажэння аб земскіх установах 1864 г. з пэўнымі змяненнямі і абмежаваннямі. Гэты дакумент яскрава пацвердзіў той факт, што галоўнай перашкодай для функцыянавання земстваў з'яўлялася адміністрацыйная апека бюракратыі, якая імкнулася кантраляваць усё: выбары, формы і метады вырашэння мясцовых пытанняў і інш. Але насуперак гэтаму імкненню інстытуты мясцовага самакіравання дэманстравалі надзвычайную стойкасць і жыццяздольнасць. Так, беларускія земствы адразу ж пачалі вырашаць тыя пытанні, якія дзесяцігоддзямі ігнараваліся царскім урадам. Перш за ўсё гэта былі пытанні аб народнай асвеце, ахове здароўя, аб жыллёвым будаўніцтве і г.д. Прычым неабходна адзначыць, што магчымасць функцыянавання земстваў у значнай ступені забяспечвала іх фінансавы суверэнітэт. Дапаўняльнай рыштай моцы земстваў з'яўляўся штат спецыялістаў з асяроддзя дэмакратычнай інтэлігенцыі (настаўнікі, адвакаты, аграномы і інш.), якія бескарысліва імкнуліся дапамагчы народу выйсці з невуцтва і беднаты.

Важную ролю ў рабоце земстваў адыгрывала галоснасць. Службовыя асобы рэгулярна выязджалі на месцы і збіралі інфармацыю аб патрэбах народа, на аснове якіх земскімі органамі прымаліся рашэнні.

Такім чынам, можна гаварыць аб тым, што нягледзячы на ўсе цяжкасці, з якімі сутыкнуўся інстытут земства на Беларусі, усё ж такі ён імкнуўся да шырокай аўтаноміі ў вырашэнні праблем мясцовага жыцця. Наперакор супрацьдзеянню расійскай бюракратыі сістэма земскага самакіравання набрала моц, набыла характар агульнадзяржаўнай сістэмы.

Увогуле можна зрабіць вывад, што ўся дзейнасць земскіх органаў на Беларусі дае выснову лічыць іх вопыт вялікай гістарычнай каштоўнасцю. На падставе гэтага потым ствараліся іншыя органы (у тым ліку ў мінулы савецкі перыяд гісторыі), якім былі ўласцівы рысы мясцовага самакіравання.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by